Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

# За ленінскія кадры

Орган парткома і прафкома Беларускага Дзяржаўнага Універсітэта

№ 10 8 СНЕЖНЯ 1935 г. № 10

...І калі мы за параўнаўча кароткія тэрміны дабіліся таго, што з учарайшых сялянскіх сыноў і дачок выпрацавалі выдатных камбайнераў і камбайнерак, якія перакрываюць нормы капіталістычных краін, то гэта значыць, што ў нас справа вырошчвання тэхнічных кадраў ідзе наперад сямімільнымі крокамі.

**І. Сталін.**

# Прамова таварыша СТАЛІНА

## на нарадзе перадавых камбайнераў і камбайнерак 1 снежня 1935 г.



Таварышы! Дазвольце перш за ўсё вітаць вас у сувязі з тымі дасягненнямі, якіх вы дабіліся на фронце ўборкі ўраджаю. Дасягненні вашы не малыя. Калі ў сярэднім па ўсяму СССР выпрацоўка на камбайн паднялася ў нас удвая за адзін год, то гэта немалое дасягненне. Гэта дасягненне асабліва важна ва ўмовах нашай краіны, дзе тэхнічна падкаваных людзей усё яшчэ мала. Наша краіна заўсёды адрознівалася недахватам тэхнічна падкаваных кадраў, асабліва ў галіне земляробства. Тэхнічная падрыхтоўка кадраў у рамках цэлай краіны—гэта вельмі вялікая справа. Яна патрабуе дзесяцігоддзяў. І калі мы за параўнаўча кароткія тэрміны дабіліся таго, што з учарайшых сялянскіх сыноў і дачок выпрацавалі выдатных камбайнераў і камбайнерак, якія перакрываюць нормы капіталістычных краін, то гэта значыць, што ў нас справа вырошчвання тэхнічных кадраў ідзе наперад сямімільнымі крокамі. Так, таварышы, вашы поспехі значныя і сур'ёзныя, і вы ў поўнай меры заслугоўваеце таго, каб кіраўнікі партыі і ўрада віталі вас. (Апладысменты).

А цяпер дазвольце перайсці да сутнасці справы.

У нас часта гавораць, што мы ўжо вырашылі зерневую праблему. Гэта, зразумела, верна, калі мець на ўвазе цяперашні перажываемы намі перыяд. Мы збіраем у гэтым годзе больш пяці з паловай мільярдаў пудоў зярна. Гэтага у поўнай меры хапае для таго, каб удосталь накарміць насельніцтва і адкласці яшчэ дастатковыя запасы, неабходныя для ўсякіх непрадбачаных выпадкаў. Гэта, зразумела, не дрэнна для сёнешняга дня. Але мы не можам абмяжоўвацца толькі сёнешнім днём. Мы павінны думаць і аб заўтрашнім дні, аб бліжэйшым будучым. А калі паглядзець на справу з пункту погляду заўтрашняга дня, то дасягнутыя рэзультаты нас не могуць задаволіць. Колькі спатрэбіцца нам зярна ў бліжэйшым будучым, скажам, гадоў праз тры-чатыры? Нам спатрэбіцца не менш сямі-васьмі мільярдаў пудоў зярна. Вось як абстаіць справа, таварышы. Значыць, мы павінны ўжо цяпер прыняць меры да таго, каб вытворчасць хлеба расла ў нас з года ў год і каб мы аказаліся к гэтаму тэрміну ў поўнай меры падрыхтаванымі да выканання гэтай важнейшай задачы. У старыя час, да рэволюцыі, наша краіна давала зярна каля чатырох-пяці мільярдаў пудоў у год. Хапала гэтага хлеба ці не—гэта іншае пытанне. Ва ўсякім выпадку ўсе лічылі, што хапала, бо кожны год вывозілі заграніцу каля 400—500 мільёнаў пудоў зярна. Так абстаяла справа ў мінулым. Іншая справа цяпер, у нашых савецкіх умовах. Я ужо гаварыў, што мы павінны ўжо цяпер рыхтавацца да таго, каб давесці ў бліжэйшым будучым, гадоў праз тры-чатыры, штогоднюю вытворчасць хлеба да 7—8 мільярдаў пудоў. Розніца, як бачыце,—немалая. То 4 або 5 мільярдаў пудоў, а то 7—8 мільярдаў пудоў зярна.

Адкуль такая розніца? Чым вытлумачыць гэты каласальны рост патрэбнасці ў зярне ў нашай краіне?

Тлумачыцца гэта тым, што наша краіна ўжо не тая, якою яна была ў стары, дарэволюцыйны час.

Пачаць хоць-бы з таго, што ў нас за апошнія гады прамысловасць і гарады выраслі прынамсі ўдвая ў параўнанні са старым часам. Зараз у нас гарадоў, жыхароў у гарадах, прамысловасці і рабочых, занятых у прамысловасці, прынамсі ўдвая больш, чым у стары час. Што гэта значыць? Гэта значыць, што некалькі мільёнаў працаўнікоў узялі мы з сяла, перавялі ў гарады, зрабілі рабочымі і служачымі, і яны цяпер разам з астатнімі рабочымі рушаць наперад нашу прамысловасць. Гэта значыць, што калі некалькі мільёнаў працаўнікоў, звязаных раней з вёскай, вытваралі хлеб, то цяпер яны не толькі не вытвараюць хлеба, а, наадварот, самі маюць патрэбу у тым, каб ім падвозілі хлеб з вёскі. А гарады ў нас будуць расці, і патрэбнасць у хлебе будзе павялічвацца.

Гэта першая прычына росту патрэбнасці ў зярне.

Далей. У стары час у нас тэхнічных культур было менш, чым цяпер. Мы выпрацоўваем цяпер бавоўны ўдвая больш, чым у стары час. Што датычыць ільну, буракоў і іншых тэхнічных культур, то мы іх выпрацоўваем непараўнаўча больш, чым у стары час. Што-ж з гэтага выцякае? А з гэтага выцякае тое, што людзі, занятыя вытворчасцю тэхнічных культур, не могуць у дастатковай ступені займацца вытворчасцю хлеба. Значыць, трэба мець вялікія запасы зярна для людзей, якія выпрацоўваюць тэхнічныя культуры, каб можна было ўсё больш і больш павялічваць вытворчасць тэхнічных культур, вытворчасць бавоўны, ільну, буракоў, сланечніку і т. д. А вытворчасць тэхнічных культур нам прыдзецца ўсё больш і больш павялічваць, калі мы хочам рушыць наперад нашу лёгкую прамысловасць і нашу харчовую прамысловасць.

Вось вам другая прычына росту патрэбнасці ў зярне.

Далей. Я ўжо гаварыў, што ў стары час вытваралі ў нас 4-5 мільярдаў пудоў зярна ў год. Царскія міністры звычайна гаварылі тады: „Самі не будзем даядаць, а хлеб вывозіць будзем". Што гэта за людзі, якія недаядалі? Зразумела, не царскія міністры. Недаядаўшыя людзі гэта—20-30 мільёнаў вясковай беднаты, якая сапраўды недаядала і жыла ўпрогаладзь для таго, каб царскія міністры мелі магчымасць вывозіць хлеб заграніцу. Так было ў стары час. Цяпер у нас зусім іншы час. Савецкі ўрад не можа дапусціць, каб насельніцтва недаядала. Вось ужо два-тры гады як беднаты ў нас няма больш, беспрацоўя не стала, недаяданне знікла, і мы грунтоўна ўступілі на шлях заможнасці. Вы запытаеце — куды дзеліся 20—30 мільёнаў галоднай беднаты? Яны перайшлі ў калгасы, абаснаваліся там і з поспехам будуюць сабе заможнае жыццё. А што гэта значыць? Гэта значыць, што нам патрабуецца цяпер значна больш хлеба для пракармлення працоўных сялян, чым у стары час, бо учарайшыя беднякі, а цяпер калгаснікі, што абаснаваліся ў калгасах, павінны мець дастаткова хлеба для таго, каб будаваць сваё заможнае жыццё. Вы ведаеце, што яны яго маюць і будуць мець яшчэ больш.

Такая трэцяя прычына каласальнага росту патрэбнасці ў зярне ў нашай краіне.

Далей. У нас цяпер усе гавораць, што матэрыяльнае становішча працоўных значна палепшылася, што жыць стала лепш, весялей. Гэта, зразумела, верна. Але гэта вядзе да таго, што насельніцтва стала размнажацца значна хутчэй, чым у стары час. Смяротнасці стала менш, нараджэнняў больш, і чыстага прыросту атрымліваецца непараўнаўча больш. Гэта, зразумела, добра, і мы гэта вітаем (вясёлае ажыўленне ў зале). Зараз у нас кожны год чыстага прыросту насельніцтва атрымліваецца каля трох мільёнаў душ. Гэта значыць, што кожны год мы атрымліваем прырашчэнне на цэлую Фінляндыю (агульны смех). Ну, а гэта вядзе да таго, што прыходзіцца карміць усё больш і больш людзей.

Вось вам яшчэ адна прычына росту патрэбнасці ў хлебе.

Нарэшце, яшчэ адна прычына. Я гавару аб людзях і аб росце іх патрэбнасці ў хлебе. Але харчаванне людзей не абмяжоўваецца адным толькі хлебам. Ім патрэбна яшчэ мяса, тлушчы. Рост гарадоў, рост тэхнічных культур, агульны рост народанасельніцтва, заможнае жыццё,—усё гэта вядзе да росту патрэбнасці ў мясе, у тлушчах. Неабходна, значыць, мець добра пастаўленую жывёлагадоўлю з вялікай колькасцю жывёлы, дробнай і буйнай, для таго, каб мець магчымасць задаволіць растучыя патрэбнасці насельніцтва ў мясных прадуктах. Усё гэта ясна. Але рост жывёлагадоўлі нямыслімы без вялікіх запасаў зярна для жывёлы. Толькі зерневая гаспадарка, якая расце і разгортваецца, можа стварыць умовы, неабходныя для росту жывёлагадоўлі.

Вось вам яшчэ адна прычына каласальнага росту патрэбнасці ў зярне ў нашай краіне.

Такія, таварышы, прычыны, якія ў корані змянілі твар нашай краіны і ставяць перад намі неадкладную задачу — давесці штогоднюю вытворчасць зярна ў бліжэйшым будучым да 7-8 мільярдаў пудоў.

Ці можам выканаць гэту задачу? Так, можам. У гэтым не можа быць сумнення.

Працяг прамовы тав. Сталіна на 2-й стар.

*КАНЕЦ ПРАМОВЫ ТАВ. СТАЛІНА.*

Што патрабуецца для таго, каб выканаць гэту задачу?

Для гэтага патрабуецца, перш за ўсё, каб пануючай формай гаспадаркі ў земляробстве была ў нас не дробная, а буйная гаспадарка. Чаму іменна буйная? Таму, што толькі буйная гаспадарка здольна асвоіць сучасную тэхніку, толькі буйная гаспадарка здольна скарыстаць у дастатковай ступені сучасныя агратэхнічныя веды, толькі буйная гаспадарка здольна прымяняць як след угнаенні. У капіталістычных краінах, дзе пануючай формай у земляробстве з'яўляецца аднаасобная дробная гаспадарка, буйныя гаспадаркі стварающца шляхам узбагачэння невялікай групы землеўладальнікаў і разарэння большасці сялян. Там звычайна землі разарыўшыхся сялян пераходзяць у рукі багатых землеўладальнікаў, а самі сяляне, каб не памерці з голаду, ідуць у найміты да гэтых землеўладальнікаў. Мы лічым гэты шлях няправільным і руйнавальным. Ён для нас не прыймальны. Мы сталі, таму, на іншы шлях утварэння буйных гаспадарак у земляробстве. Мы сталі на шлях аб'яднання дробнасялянскіх гаспадарак у вялікія калектыўныя гаспадаркі, якія апрацоўваюць зямлю калектыўнай працай і якія карыстаюцца ўсімі благамі і магчымасцямі буйнай гаспадаркі. Гэта ёсць шлях калгасаў. Ці з'яўляецца для нас цяпер калгасная форма буйнай гаспадаркі пануючай формай нашага земляробства? Так, з'яўляецца. У калгасах у нас ёсць цяпер каля 90 проц. усяго сялянства. Значыць, буйная гаспадарка ў земляробстве, калгасная гаспадарка як пануючая форма,—у нас ужо ёсць у наяўнасці.

Для гэтага патрабуецца, па другое, каб у калгасаў, у нашых буйных гаспадарак было дастаткова выгодных земляў. Ці ёсць такія землі у нашых калгасаў? Так, ёсць. Вы ведаеце, што ўсе царскія, памешчыцкія і кулацкія землі пераданы ўжо калгасам. Вы ведаеце, што гэтыя землі ўжо замацаваны за калгасамі навечна. Значыць, у калгасаў маецца дастаткова выгодных зямель для таго, каб разгарнуць ва ўсю вытворчасць зярна.

Для гэтага патрабуецца, па-трэцяе, каб у калгасаў было дастаткова тэхнікі, трактараў, сельскагаспадарчых машын, камбайнаў. Самі разумееце, што на адной толькі ручной працы далека не паедзеш. Значыць, патрэбна багатая тэхніка для таго, каб калгасы маглі разгарнуць вытворчасць зярна. Ці ёсць у калгасаў такая тэхніка? Так, ёсць. І чым далей, тым больш будзе ў іх гэтай тэхнікі.

Для гэтага патрабуецца, нарэшце, каб у калгасаў былі людзі, кадры, якія ўмеюць абыходзіцца з тэхнікай, асвоілі гэту тэхніку і навучыліся асядлаць яе. Ці ёсць у калгасаў такія людзі, такія кадры? Так, ёсць. Праўда, яшчэ мала, але ўсё-ж яны ёсць. Гэта нарада, дзе прысутнічаюць лепшыя камбайнеры і камбайнеркі і якая прадстаўляе толькі невялікую частку той арміі камбайнераў і камбайнерак, якія ёсць у калгасаў,—гэта нарада з'яўляецца доказам таго, што такія кадры ўжо нарадзіліся ў калгасах. Праўда, іх, гэтых кадраў, усё яшчэ мала, і ў гэтым, таварышы, галоўная наша загвоздка. Але няма падстаў сумнявацца ў тым, што колькасць гэтых кадраў будзе расці ў нас не гадамі і месяцамі, а днямі і гадзінамі.

Выходзіць, такім чынам, што мы маем усе ўмовы, неабходныя для таго, каб дабіцца ў бліжэйшым будучым штогоднай вытворчасці зярна ў размеры 7—8 мільярдаў пудоў.

Вось чаму я думаю, што неадкладная задача, аб якой я гаварыў вышэй, безумоўна ажыццявіма.

Галоўнае цяпер у тым, каб налегчы на кадры, абучыць кадры, дапамагчы адстаючым асвоіць тэхніку, вырошчваць з дня ў дзень людзей, здольных асвоіць тэхніку і пагнаць яе наперад. У гэтым цяпер галоўнае, таварышы.

Асаблівую ўвагу патрэбна звярнуць на камбайны і на камбайнераў. Вы ведаеце, што самая адказная справа ў зернавой гаспадарцы уборка. Уборка—справа сезонная і яна не любіць чакаць. Сабраў своечасова—выйграў, спазніўся ва ўборцы—прайграў. Значэнне камбайна заключаецца ў тым, што ён дапамагае сабраць ураджай своечасова. Гэта вельмі вялікая і сур'ёзная справа, таварышы.

Але значэнне камбайна гэтым не абмяжоўваецца. Яго значэнне заключаецца яшчэ ў тым, што ён пазбаўляе нас ад велізарных страт. Самі ведаеце, што ўборка пры дапамозе лабагрэйкі дае велізарныя страты зярна. Спачатку скасіць, потым сабраць у снапы, потым сабраць у скірты, потым звозіць ураджай да малатарань,—усё гэта страты і страты. Усе прызнаюць, што пры гэтай сістэме ўборкі мы трацім каля 20—25 проц. ураджаю. Вялікае значэнне камбайна заключаецца ў тым, што ён даводзіць гэтыя страты да нязначнага мінімума. Знаўцы справы гавораць, што ўборка пры дапамозе лабагрэйкі пры іншых роўных умовах дае ўраджайнасць на гектар на 10 пудоў менш, чым уборка пры дапамозе камбайна. Калі ўзяць сто мільёнаў гектараў зернавых пасеваў, а іх у нас значна больш, як вядома, то страты пры ўборцы лабагрэйкамі складуць мільярд пудоў зярна. Спрабуйце цяпер арганізаваць уборку на гэтых ста мільёнах гектараў пры дапамозе камбайна, маючы на ўвазе, што камбайн працуе не дрэнна,—і вы атрымаеце выйгрыш на цэлы мільярд пудоў зярна. Лічба не малая, як бачыце.

Вось да чаго вялікае значэнне камбайна і людзей, якія працуюць на камбайне.

Вось чаму я думаю, што ўкараненне камбайна ў земляробства і вырошчванне шматлікіх кадраў камбайнераў і камбайнерак з'яўляецца першаступеннай задачай.

Вось чаму, заканчваючы прамову, я хацеў-бы выказаць пажаданне, каб лік нашых камбайнераў і камбайнерак рос не па днях, а па гадзінах, каб яны, абучаючыся тэхніцы камбайна і абучаючы гэтай справе сваіх таварышоў, сталі, нарэшце, сапраўднымі пераможцамі ў сельскай гаспадарцы нашай краіны.

(Б у р н ы я, д о ў г і я  а п л а д ы с м е н т ы, я к і я  п е р а х о д з я ц ь  у  а в а ц ы ю,  г у ч н а е  „у р а", в о к л і ч ы  з  м е с ц:  „Н я х а й  ж ы в е  л ю б і м ы  С Т А Л І Н!").

Яшчэ два словы, таварышы. Мы тут у прэзідыуме цішком гутарылі і знайшлі, што трэба было-б прадставіць удзельнікаў данай нарады к вышэйшай узнагародзе, кордэну—за добрую работу. Мы гэту справу думаем правесці, таварышы, у бліжэйшыя дні.

(Б у р н ы я, д о ў г і я  а п л а д ы с м е н т ы,  к р ы к і  „у р а",  в о к л і ч ы:  „Д з я к у й  т а в а р ы ш у  С Т А Л І Н У!").

## Жыццё становіцца лепшым

4-га снежня на ўсіх факультэтах у паліт і комсамольскіх школах прапрацоўвалася прамова тав. Сталіна на нарадзе перадавых камбайнераў і камбайнерак. Студэнты у сваіх выступленнях яшчэ і яшчэ раз адзначалі, што жыццё становіцца ўсё лепшым і лепшым.

Увечары 5-га снежня група студэнтаў—25 чалавек прапрацавалі прамову тав. Сталіна ў сваім падшэфным калгасе імя Войкава.

# ПАМЯЦІ
# Сергея Міронавіча Кірава

**У тыя дні**

... 1 снежня 1934 г., 16 гадзін 30 мінут... У будынку Ленінградскага совета ад рукі подлага забойцы, ворага рабочага класа загінуў Сергей Міронавіч Кіраў. Загінуў адзін з лепшых сыноў краіны, верны і мужны саратнік Леніна і Сталіна, выдатнейшы дзеяч, палкі трыбун партыі. Няма Кірава. Усю неабдымную краіну ўзварушыла гэта трагічная вестка.



**У тыя дні**

... Гарады, калгасы, заводы, цэхі, навучальныя ўстановы ў глыбокай жалобе. Прыспушчаны ч ы р в о н ы я сцягі з чорнымі істужкамі. Шматлікія жалобныя мітынгі, пленумы, дэманстрацыі! Вялікі боль... Цяжкая ўтрата...

... У сувязі з няшчасцем, якое напаткала партыю і рабочы клас Совецкага Саюза, 2-га снежня раніцою ў Ленінград прыбылі тт.Сталін,Молатаў, Варашылаў і Жданаў.

## Верны сын партыі

**(Урывак з прамовы С. М. Кірава на XVII з'ездзе ВКП(б)**

... Таварыш Сталін гаварыў, што мы закончылі фундамент соцыялістычнай будоўлі, што мы разгортваем работу для таго, каб пабудаваць на гэтым вялікім фундаменце ўсе надбудовы, якія створаць новае, небывалае ў гісторыі чалавецтва грамадства, комуністычнае грамадства.

Работа, таварышы, не толькі захапляючая, але работа вельмі цяжкая, вельмі складаная і вельмі адказная. Але, калі мы маем такі гераічны рабочы клас, які насяляе нашу совецкую краіну, калі мы маем такую партыю, якую выпеставаў найвялікшы з людзей—Уладзімір Ільіч Ленін, цвет якой засядае вось тут зараз, партыю, якая не ведае ніякіх перагарод, ніякіх перашкод, партыю, у якой у праваце сваёй справы няма ні малейшага сумнення, я думаю, што з такой партыяй, з такім рабочым класам стаячыя ўперадзе задачы не толькі вырашальны, але вырашальны бліскуча і вырашальны пераможна, тым больш, што асноўныя труднасці ўжо засталіся ззаду.

Таварышы, дзесяць гадоў таму назад мы пахавалі таго, хто стварыў нашу партыю, хто стварыў нашу пролетарскую дзяржаву. Але таксама дзесяць гадоў таму назад вуснамі лепшага прадаўжальніка справы Леніна, лепшага кормчага нашай вялікай соцыялістычнай будоўлі, нашай мільённай партыі, нашага мільённага рабочага класа, вуснамі гэтага лепшага мы далі свяшчэнную клятву выканаць вялікія заветы Леніна. Мы, таварышы, з гонарам перад памяццю Леніна можам сказаць: мы гэту клятву выконваем, мы гэту клятву і надалей будзем выконваць, бо клятву гэту даў вялікі стратэг вызвалення працоўных нашай краіны і ўсяго свету—таварыш Сталін.

## Жалобны сход

...Марозны вечар. Якраз такі сумны, жалобны, як год таму назад. Усюды акаймленныя чорным крэпам партрэты Сергея Міронавіча. У святле электрычных ліхтароў калышуцца чырвоныя сцягі, перавязаныя чорнай істужкай...

Студэнты, навуковыя работнікі і тэхперсанал сабраліся на жалобны сход, прысвечаны памяці Сергея Міронавіча Кірава.

...Даклад аб жыцці і рэволюцыйнай дзейнасці Сергея. Міронавіча. Затым выступленні студэнтаў, навуковых работнікаў. Словы выступаючых гучэлі, як гром абурэння і нянавісці да ворагаў, ад рукі якіх загінуў любімы Сергей Міронавіч.

У часе схода выкладчыкі рабфака Крук і Цывін падалі заявы аб уступленні ў спачуваючыя.

Сход паслаў прывітанне кіраўніку большэвікоў Беларусі—таварышу Гікало.

## Дарагі Нікалай Фёдаравіч!

Год таму назад перастала біцца палкае сэрца аднаго з лепшых кіраўнікоў нашай партыі—**Сергея Міронавіча Кірава.** Куля, выпушчаная зладзейскай рукой падонкаў трацкісцка-зіноўеўскага ахвосця, абарвала гераічнае жыццё палкага трыбуна рэволюцыі, выдатнейшага байца слаўнай большэвіцкай кагорты, бліжэйшага друга і саратніка вялікага Сталіна, любімца ўсёй партыі і народа.

Гэтым зладзействам вораг спадзяваўся растроіць большэвіцкія рады, аслабіць магутнасць пролетарскай дыктатуры. Але вораг пралічыўся. Магутнасць большэвіцкай партыі, нашай соцыялістычнай радзімы непарушны. Соцыялізм перамог і канчаткова ўмацоўваецца на ўсіх вучастках нашага жыцця. Жыцць становіцца ўсё лепш і весялей.

Сёння, адзначая светлую памяць Сергея Міронавіча, мы, яшчэ шчыльней згуртоўваемся вакол нашай слаўнай партыі і любімага правадыра тав. Сталіна.

У сваёй практычнай рабоце яшчэ больш узмацнім большэвіцкую пільнасць да астаткаў ненавіснага класавага ворага. Узброіўваючыся тэорыяй Маркса-Энгельса-Леніна-Сталіна, вывучаючы гісторыю большэвізма, вывучаючы рэволюцыйны шлях тав. Кірава, і следуючы яго прыкладу, усе нашы веды аддадзім на службу соцыялістычнага будаўніцтва, на службу пролетарскай культуры, на большэвіцкае выхаванне маладога пакалення дастойнага нашай эпохі.

Будзем работаць па кіраўску!

Будзем яшчэ лепш вучыцца, лепш працаваць!

Нахай жыве наша комуністычная партыя і яе любімы правадыр Сталін!

Нахай жыве КП(б)Б на чале з тав. Гікало!

# Лепшыя кнігі—калгаснай вёске!

*Універсітэт уключыўся ў збор кніг для калгаснай вёскі. Мы ўжо маем добрыя прыклады ў гэтай справе. Сабраны дзесяткі вельмі каштоўных твораў класікаў марксізма-ленінізма, мастацкай літаратуры, а таксама многа кніг сучасных паэтаў і пісьменнікаў. Але-ж, на гэтым застанаўлівацца мы не павінны. Трэба адзначыць, што яшчэ да гэтага часу гістарычны факультэт (прафорг Куксо) не ўключыўся ў збор кніг.*

*Неабходна так арганізаваць гэтую работу, каб кожны студэнт, кожны навуковы работнік прыняў удзел у зборы кніг. Універсітэт мае ўсе магчымасці паслаць калгаснай вёске сотні лепшых кніг.*

## Матэматыкі перадавікі ў зборы кніг

Усім вядома, якая цяпер цяга калгасніка да кніг, да ведаў. Пагэтаму не прыходзіцца гаварыць аб важнасці пытання збору літаратуры для калгаснай вёскі.

Група матэматыкаў IV курса, абгаварыўшы гэта пытанне на сходзе, узялі абавязацельства сабраць літаратуры на суму не менш 50 руб. На сёння гэты соцабавязак перавыканан. Сабрана 130 вельмі каштоўных кніг, на суму 90 руб.

Сярод кніг ёсць многа твораў класікаў марксізма-ленінізма, ёсць твор тав. Сталіна — „Марксізм і нацыянальна-каланіяльнае пытанне“. З мастацкай літаратуры „Дрыгва“ Я. Коласа, „Разгром“ — Фадзеева, творы Горкага і г. д.

Асабліва многа кніг унеслі таварышы: Ватнік, Бароў, Галубенка Іх прыкладу павінны паследваць усе студэнты факультэта.

**Калачоў.**

## Біяфакаўцы сабралі 300 кніг

Студэнты біяфака першымі ў БДУ разгарнулі збор кніг для калгаснай вёскі. На сёння біяфакаўцы сабралі 300 кніг. У ліку сабранай літаратуры ёсць творы Пушкіна, Гогаля, Горкага, сучасных паэтаў і пісьменнікаў, а таксама многа твораў класікаў марксізма-ленінізма.

Вялікую актыўнасць у зборы кніг паказалі студэнты Акуліч, Лук'яновіч, Завістовіч, Шац і інш. Тав. Акуліч першай унесла 30 кніг з сваёй уласнай бібліятэкі.

Усе факультэты павінны раўняцца па біяфаку і неадкладна разгарнуць збор літаратуры для калгаснай вёскі.

**В. Ладуцька.**

* * *

На другім і трэцім курсе хімфака сабрана для калгаснай вёскі 54 кнігі. Збор кніг прадаўжаецца. Трэба адзначыць, што студэнты першага і чацвертага курса яшчэ ў гэтую важную справу не ўключыліся.

**Вальчэўская.**

## Падшэфнаму калгасу адпраўлена бібліятэчка

5-га снежня студэнцкі калектыў БДУ адправіў у свой падшэфны калгас імя Войкава, Гатаўскага сельсовета, Менскага раёна, бібліятэчку ў 300 кніг.

Сярод пасланых кніг ёсць „Што рабіць“ — Леніна, „Марксізм і нацыянальна-каланіяльнае пытанне“ — Сталіна, многа кніг Горкага, „Дрыгва“ Якуба Коласа, а таксама рад кніг па сельскай гаспадарцы.

**Юшпэ**

*НА ТЭМЫ ДНЯ*

## „Наследнікі Екацерыны“

Вядомая сваім распуствам, нязноснай эксплаатацыяй працоўных, руская імператрыца Екацерына II да гэтага часу лічылася не дасягнутай і па непісьменнасці. Яна ў слове з трох літар рабіла чатыры памылкі: замест „еще“—пісала „исчо“.

У наш век, калі працоўныя нашай радзімы пабеданосна будуюць сваю соцыялістычную культуру, не можа быць месца і спадчыне царызма—безкультур'ю і непісьменнасці. Аднак, у нас ёсць многа студэнтаў універсітэта, якія не адстаюць ад Екацерыны па непісьменнасці, а нават часта пабіваюць яе рэкорды.

Так, напрыклад, на другім курсе гістфака ёсць студэнт Церашэнка. Ён не так даўно скончыў педагагічны тэхнікум у Беларусі; працаваў перад паступленнем у БДУ дырэктарам няпоўнай сярэдняй школы, але піша ён па прынцыпу „як уздумаецца, так і пішацца“. Ніякіх правапісаў для яго не існуе. Розніцы паміж беларускай і рускай мовай ён не знаходзіць, а выводзіць якуюсьці змешаную мову.

У пісьмовым дакладзе па гісторыі Беларусі, які ён некалькі разоў перапрацаваў, зачытваў перад групай, на першай старонцы зрабіў сорак граматычных памылак.

Вось кароценькі ўрывак з яго творчасці: „каоперацыя, заснованая на падзілі праці, яна гасподствовыла на заходзе прыблізна паловы XVI ст. і до последней трэці XVIII стаг“. Такія словы, ак майстэрня, мануфактура, узмоцненая, ён піша так: „мастэрні, маныфактур, узмацненная“. „Ї памры Дзяніс, а горш не напішаш“...

Не адстае ад Церашэнка і студэнт таксама другога курса гістфака тав. Багалюбаў. На днях ён запаўняў анкету ў РК КП(б)Б на прапагандыста і запоўніў яе так непісьменна, што члены камісіі былі ў роспачы і вымушаны былі запытацца; „У якім класе вы вучыцеся?!“

Ёсць і на геафаке асобныя „наследнікі Екацерыны“. Так, на першым курсе студэнт Нікалаеў піша: „у грамадзкім жыцьці“, „камсамолец“ і г. д.

Гэтыя людзі не жадаюць ліквідаваць сваю непісьменнасць. Вы ніколі не ўбачыце, каб яны вывучалі правапіс беларускай мовы. Грамадскія арганізацыі універсітэта і насценны друк не толькі не вядуць барацьбы з непісьменнасцю, але самі пашыраюць яе.

Не так даўно ў біялагічным корпусе вісела невялікая аб'ява наступнага зместу: „Наступныя таварышы павіны у 5-ці дзёны срок здаць ў ваену каф. ніжэйпералічанае... спіс перадаецца для высчату з стэпэндыі. Бюро Фізкультуры“. Таксама ў аб'яве прафкома мы на днях чыталі, што будзе лекцыя „аб пралятарскім гуманізмі“.

Такое становішча з пісьменнасцю студэнтаў універсітэта патрабуе тэрмінова ад дэканатаў і грамадскіх арганізацый прыняць захады для арганізацыі гурткоў па вывучэнню беларускай мовы.

**Вас. Фомін.**

*ГІМНАСТЫЧНАЯ СЕКЦЫЯ*



## Універсітэцкая алімпіяда студэнцкай самадзейнасці

Прафком і камітэт комсамола праводзяць агульнауніверсітэцкую алімпіяду студэнцкай самадзейнасці. Алімпіяда адбудзецца ў канцы снежня.

У алімпіядзе прымаюць удзел: струнны гурток, харгурток, літгурток, аркестр, індывідуальныя выступленні і фізкультурныя секцыі.

Лепшыя ўдзельнікі алімпіяды будуць прэміраваны. На прэмію вызначана адна мандаліна, адна гітара і дзве балалайкі.

*ЗАМЕЖНАЯ МОВА*

## Другі курс павінен браць прыклад з першага

Першы курс геафака працуе па нямецкай мове добра. Адчуваецца зацікаўленасць і жаданне студэнтаў аўладаць замежнай мовай. Некаторыя студэнты 1-га курса, якія прыйшлі са слабай падрыхтоўкай, дзякуючы ўпартай рабоце дабіліся добрых вынікаў. Да такіх таварышоў адносяцца, Каласоўскі, Іскіна, Стоцкі, Пекарскі.

Па першай кантрольнай рабоце быў значны процант нездавальняючых ацэнак. Апошняя кантрольная работа дала амаль што 100 проц. „добрых“ і „здавальняючых“ ацэнак. Да канферэнцыі абедзве групы падрыхтаваліся добра. Сшыткі ў большасці студэнтаў вядуцца акуратна.

На вялікі жаль нельга гэтага сказаць пра 2 курс геафака. Значная частка студэнтаў рыхтуе матэрыял павярхоўна. Слаба наладжана дапамога адстаючым. Для тлумачэння гэтага становішча шукаюцца аб'ектыўныя прычыны: загружанасць іншымі прадметамі, неўдалы расклад, адсутнасць кніг, слоўнікаў.

Усё гэта так, але ўсё-ж такі пры належнай увазе з боку трыкутнікаў і больш добрасумленных адносін самых студэнтаў можна было-б працаваць значна лепш. Пасля апошняй кантрольнай работы, якая дала вялікі процант „нездавальняючых“ ацэнак, пачаўся пералом. У групах пачалі біць трывогу, узяліся за працу гурткі.

**А. Шкляева.**

*НАМ ПІШУЦЬ*

## З запазычанасцю не раскваталіся

За ўвесь гэты час на фізмаце не здолелі ліквідаваць запазычанасць мінулага года. Дзевяць студэнтаў на сёнешні дзень, не гледзячы на тое, што ім былі прадстаўлены ўсе ўмовы падраўняцца з астатнімі студэнтамі (дапамога з боку мацнейшых, падручнікі, час для падрыхтоўкі), цягнуцца ў хвасце.

Хто яны? 1. Небосеў—запазычанасць па механіке;

2. Савіцкі—па электрычнасці, механіке;

3. Маклакоў—па тэарэтычнай фізіцы.

Яны абавязаліся перад грамадскасцю курса здаць запазычанасць да свята XVIII гадавіны Кастрычніка. Але ўзятыя на сябе абавязкі не выканалі. Не трэба забывацца, што яны студэнты IV курса і праз два месяцы павінны будуць прыступіць да дыпломнай работы.

Вялікая запазычанасць маецца таксама і па другому курсу фізікаў.

1. Таўмін—фізіка, аналіз;
2. Акімава—фізіка, аналіз, хімія;
3. Кавецкая—аналіз;
4. Лугаўцоў—фізіка;

Гэтае ганебнае з'явішча тлумачыцца тым, што студэнты, маючыя запазычанасць яшчэ па-сапраўднаму не ўзяліся за работу. Тлумачыцца гэта і тым, што дэканат праяўляе лібералізм і нават, горш таго...

Як можна тлумачыць такі факт, што студэнт Тумас мае запазычанасць па 5-ці прадметам з другога курса, а зараз ён займаецца на трэцім курсе і атрымоўвае стыпендыю?

**Фізматавец.**

## У інтэрнаце цёмна і дымна

Падрыхтоўка Нова-Мясніцкага інтэрната да зімовага перыяду праведзена нездавальняючы. Печы не адрамантаваны. У час топкі ўвесь дым ідзе не на двор, а ў пакоі.

Т. Шастакоўскі даў распараджэнне каменданту т. Коласу выклікаць тэрмінова майстра і аглядзіць печы, але-ж Колас не патурбаваўся выканаць загад.

Не лепш абстаіць справа і са светам. Нельга ні рыхтаваць лекцыі, ні пачытаць газету. Маленькая лампачка № 5, або 8 не можа асвятліць пакой на 8—9 чалавек.

**Жыхар.**

**Ч. в. а. адк. рэдактара ГУЗЕЙ**

Горліт. № 3187 Тыраж 1500. Зак. 856
Друкарня БелАН.